# З чаго складаецца шчасце?

**Загадчыца Пятрэвіцкага сельскага Дома культуры Вольга Грахоўская ўдастоена высокай дзяржаўнай узнагароды — ордэна Маці. Гісторыя нашай гераіні — натхняльны аповед пра тое, як быць мамай, жонкай, творчай асобай і неад'емнай часткай сваёй вёскі, не раздзяляючы гэтыя ролі, а зліваючы іх у гарманічнае, поўнае сэнсу жыццё.**



Вольга Грахоўская знайшла сваё пакліканне, ідучы за гуканнем сэрца. Родам яна з Віцебска, вырасла ў Мсціславе Магілёўскай вобласці. З дзяцінства марыла аб танцах і планавала паступаць у харэаграфічны каледж. Аднак лёс распарадзіўся інакш: скончыла Мінскі дзяржаўны тэхналагічны каледж, атрымала навыкі мадэльера, прадпрымальніка ў сферы абслугоўвання і прафесію цырульніка. У каледжы пазнаёмілася з будучым мужам Дзмітрыем Герыновічам. Пасля нараджэння дваіх дзяцей сям'я пераехала на яго малую радзіму, у Пятрэвічы Навагрудскага раёна.

З заканчэннем кожнага адпачынку па доглядзе дзіцяці Вольга збіралася адкрыць уласную справу — аказваць аднавяскоўцам паслугі ў сферы прыгажосці. Але культура, па словах гераіні, “не адпускала”. У адным з такіх “адпачынкаў” яе запрасілі ў наваствораны пры ДК калектыў “Пятрэвіцкі батальён”. Ідэя належала Аксане Іванаўне Засадзінскай, завучу мясцовай школы. Гурт спецыяльна арганізоўвалі для маладых мам у дэкрэце, каб яны маглі спяваць, танцаваць і напаўняць будні вёскі творчасцю.

— Я не мела спецыяльнай адукацыі, — успамінае Вольга. — Але на сцэне адчувала сябе ўпэўнена, бо з дзяцінства танцавала.

Паступова хобі перарасло ў справу жыцця. Вольга Грахоўская атрымала дыплом Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, з часам стала загадчыцай Пятрэвіцкага сельскага Дома культуры. Нават цяпер, знаходзячыся ў адпачынку пасля нараджэння малодшай дачкі, Вольга не кідае калектыў: удзельнічае ў канцэртах і двойчы на тыдзень наведвае рэпетыцыі. А калі трэба рыхтавацца да нейкага адказнага мерапрыемства, ніхто ўвогуле не сочыць ні за часам, ні за колькасцю заняткаў.

## НАРОДНЫ КАЛАРЫТ

“Пятрэвіцкі батальён” не проста творчы калектыў. Гэта з'ява, вядомая далёка за межамі Навагрудчыны. Налета гурту споўніцца 10 гадоў, і ўвесь час ён захоўвае ўнікальны фармат.

— У нас няма такога, што хтосьці руліць, хтосьці прыдумляе, — распавядае Вольга. — Нават няма мастацкага кіраўніка. Усё робім сумесна. Таму і атрымліваецца ўсё палымяна, з разыначкай. Рэпертуар нараджаецца з жыцця. Што бачым, пра тое спяваем — каларытна, самабытна, па-пятрэвіцку.

Калектыў выконвае гумарыстычныя песні-пераробкі на беларускай мове, зараджаючы гледачоў энергіяй і весялосцю. Выступаюць у народных касцюмах, але на сучасны манер. Нядаўна “Пятрэвіцкі батальён” запальваў на абласных “Дажынках” у Ваўкавыску — адзіны сярод 17 найлепшых калектываў рэгіёна без звання народнага або заслужанага. Але, як падкрэслівае Вольга, гэта не перашкодзіла быць на роўных з тытуляванымі калегамі.

## НЕ ДЛЯ СПРАВАЗДАЧЫ

Праца ў ДК для Вольгі Грахоўскай — місія па захаванні і ажыўленні вясковых традыцый. Напрыклад, у Пятрэвічах адрадзілі і ператварылі ў брэндавае мерапрыемства старадаўні абрад “Пятроўскі вянок”, які штогод праводзяць 12 ліпеня, у дзень святых Пятра і Паўла.

Удзельнікі калектыву напярэдадні плятуць болей за сотню вянкоў з бярозы павіслай, упрыгожваюць іх кветкамі. Надзяваюць нацыянальныя касцюмы, бяруць баяніста і абыходзяць вёску.

— Раней на Пятра і Паўла выганялі кароў у поле, пастухі накідвалі каровам вянкі на рогі, — тлумачыць Вольга сутнасць звычаю. — Людзі ўжо ведаюць, нас чакаюць. Мясцовыя запрашаюць сваякоў з іншых населеных пунктаў. Ладзяць застолле. Падчас свята мы спяваем абрадавую песню: “У-ха-у-ха-ха, на дварэ сёння Пятра. // Мы вяночак вам кідаем // І з Пятром вас паздраўляем”. Яе самі прыдумалі, стварыўшы новую традыцыю. У дамы закідваем вянкі-абярэгі. Людзі вераць, што яны будуць ахоўваць сем'і цэлы год.

Калі Вольга сыходзіць у чарговы дэкрэт, усе адразу заўважаюць яе адсутнасць. Таму яна імкнецца не пакідаць калектыў надоўга. “Хочацца, каб жыла вёска”, — проста і ёмiста фармулюе шматдзетная маці галоўную мэту сваёй культурнай дзейнасці.

## ХОБІ — ЖЫЦЦЁ Ў ВЁСЦЫ

За званнем “шматдзетная маці” ў Вольгі Грахоўскай стаіць глыбока свядомы шлях. У Вольгі і Дзмітрыя пяцёра дзяцей: Лізавета (16 гадоў), Анастасія (14), Сцяпан (10), Злата (5), Кіра (1 год і 8 месяцаў).

— Яны павінны добрымі людзьмі вырасці. Таму галоўная задача бацькоў — даць любоў і клопат. Самае галоўнае — калі ў сям'і ёсць любоў, — упэўнена Вольга.

Яна з удзячнасцю гаворыць аб падтрымцы мужа, які працуе машыністам лесанарыхтоўчай машыны ў Навагрудскім лясгасе. Дзмітрый не толькі надзейная апора ў побыце, але і актыўны памочнік у творчым жыцці жонкі: гатуе традыцыйную юшку і кашу для вялікіх народных гулянняў, дапамагае арганізаваць вогнішча на Купалле.

Дзеці ў дружнай пары растуць таленавітымі і самастойнымі. Старэйшая Лізавета сёлета паступіла ў Лідскі дзяржаўны музычны каледж па класе цымбалаў. Анастасія — выдатніца і алімпіяднiца, захапляецца біялогіяй. Сцяпан, акрамя вучобы ў музычнай школе па класе цымбалаў, займаецца лёгкай атлетыкай у Навагрудскай ДЮСШ. Усе бясплатна наведваюць музычную школу дзякуючы статусу шматдзетнай сям'і. А пасля дапамагаюць па гаспадарцы: разам нарыхтоўваюць грыбы, ягады, робяць закруткі. “Калі запытваюць, якое ў мяне хобі, адказваю: жыццё ў вёсцы”, — гаворыць Вольга Грахоўская.

Яна яскравы прыклад таго, што сапраўднае шчасце складаецца з любові да сям'і, адданасці сваёй справе і глыбокай сувязі з радзімай. І ордэн Маці не проста ўзнагарода за нараджэнне пяцярых дзяцей. Гэта прызнанне высокіх маральных якасцей жанчыны, якая ўзяла на сябе адказнасць за прывіццё культуры і павагі да нацыянальных традыцый Беларусі не толькі сваім дзецям, але і ўсім навакольным.

**Віктар ГАЎРЫШ**

Фота з архіва сям'і